# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА Л. Д. БЯРОЗКІНАЙ



**Лідзія Дзям’янаўна Бярозкіна. Кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – верасень 1942 г.

**Месца дзеяння:**

гарадская ўправа, друкарня і вузел сувязі г. Віцебска

**Колькасць:**

10 чалавек

**Кіраўнікі:**

Лідзія Бярозкіна («Бомба»)

Дзейнічала ў гарадской управе, друкарні і на вузле сувязі з ліпеня 1941 г. да верасня 1942 г. Аб'ядноўвала 10 чалавек, сярод іх: Л. Д. Бярозкіна («Бомба»), студэнтка педінстытута З. Ц. Васільева, работнікі абласной друкарні Я. Я. Ваўчок і В. Д. Карняшонак, супрацоўнік тэлефоннай станцыі М. У. Вараб'ёў, М. І. Захараў і яго жонка П. І. Гаўберг-Іванова, чыгуначнік А. Г. Канаплёў, В. М. і Б. В. Салаўёвы (бацька і сын).

Па радыёпрыёмніку, які ўстанавіў Канаплёў у падвале дома № 4 па вул. Савецкай, Бярозкіна і Канаплёў слухалі і запісвалі зводкі Саўінфармбюро і знаёмілі з іх зместам найбольш давераных асоб са свайго асяроддзя. Але 19 снежня 1941 г. Андрэй Канаплёў быў высачаны і павешаны акупантамі. Групу ўзначаліла Бярозкіна. Цэнтрам стала жыллё Захаравых па вул. Замкавай, д. 3, дзе кватаравала Лідзія Дзям'янаўна. Гаспадыня кватэры Гаўберг-Іванова выконвала ролю сувязной з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава). Група кантактавала таксама і з партызанскім атрадам М. Ф. Біруліна (з красавіка 1942 г. у складзе 1-й Беларускай партызанскай брыгады).

Падпольшчыкі вялі антыфашысцкую прапаганду, забяспечвалі партызан разведінфармацыяй, перадавалі медыкаменты, ратавалі ваеннапалонных і дапамагалі ім выходзіць з горада да партызан. Група Бярозкінай – адзіная ў Віцебску, якая наладзіла выпуск савецкіх лістовак непасрэдна ў горадзе. Камсамольцы Ваўчок і Карняшонак, якія працавалі ў друкарні прафашысцкай газеты «Новый путь», на працягу лета і восені 1942 г. рэгулярна выраблялі і распаўсюджвалі лістоўкі. Праз урача М. Б. Мурашка (член падпольнай групы медработнікаў) Гаўберг-Іванова атрымлівала медыкаменты.

У пачатку верасня 1942 г. патрыёты распрацавалі план знішчэння савецкага вузла сувязі. 7 верасня Л. Бярозкіна прынесла Мікалаю Вараб'ёву, які працаваў на тэлефоннай станцыі, міны і ўзрыўчатку. Камсамолка не здагадвалася, што яе дапільноўваў правакатар Анатоль Бялячыц. Канспіратары былі схоплены. Затым адбыўся вобыск на кватэры М. І. Захарава, дзе пражывала падпольшчыца, падчас якога былі знойдзены міны і лістоўкі. У засценкі СД-9 трапілі З. Ц. Васільева, М. І. Захараў, а пазней Ваўчок і Карняшонак, якія былі схоплены ў той момант, калі набіралі гітлераўцы катавалі патрыётаў. Але ўсе трымаліся мужна і ўратавалі ад арышту Гаўберг-Іванову.

22 верасня 1942 г. каля Смаленскага рынку акупанты павесілі Л. Д. Бярозкіну, З. Ц. Васільеву, Я. Я. Ваўчка, М. І. Захарава і В. Д. Карняшонка.

У 1968 г. на месцы іх пакарання ўзведзены помнік. На брацкай магіле падпольшчыкаў (вул. 3-я Полацкая, Новасямёнаўскія могілкі) у 1971 г. устаноўлена мемарыяльная пліта, на будынку друкарні (вул. Шчарбакова-Набярэжная, 6) – мемарыяльная дошка. П. І. Гаўберг-Іванова і М. І. Захараў узнагароджаны.



**Помнік падпольшчыкам на Смаленскай плошчы г. Віцебска, дзе ў 1942-43 гадах нацысты пакаралі членаў падпольнай групы Л. Д. Бярозкінай**
Крыніца фотаздымка: «Віцебская энцыклапедыя»




**Мемарыяльная пліта падпольшчыкам-тыпаграфістам на будынку друкарні (вул. Шчарбакова-Набярэжная, 6)**
Крыніца фотаздымка: «Віцебская энцыклапедыя»

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Бярозкінай Л. Д. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Л. Д. Бярозкінай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 481–482.

3. **Подлипский А. М.** К вопросу о биографиях участников Витебского патриотического подполья в годы Великой Отечественной войны З. Васильевой и Л. Березкиной // Репозиторий Витебского государственного университета имени П. М. Машерова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rep.vsu.by/handle/123456789/4833. – Дата доступа: 07.09.2021.

3. **Красновская, Н.** Мы – наследники Победы / Н. Красновская // Мир вокруг нас (Витебск). – 2010. – № 15. – С. 12–13.

4. **Подпольная** группа Березкиной Л. Д. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 285.

5. **Правда** против лжи // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н.В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 105–115.